■ Захоўваць заўжды

# Іспыт на галоўнай сцэне



**Ці бачылі вы, як на Мазыршчыне выканаўцы народнага танца «Зайчык» скачуць цераз вілкі для гаршкоў? Ці чулі вы, як у Чачэрскім раёне танцуюць «Барыню» і адначасова расказваюць гледачам пра свае хатнія справы? Ці ведаеце вы, што парны танец «Сто адзін» у самым хуткім тэмпе здаўна выконваюць пад Барысавам?**





Шмат цікавага пра народныя танцы даведаліся гледачы незвычайнага канцэрта, які днямі адбыўся на галоўнай сцэне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва. Справаздачнае выступленне наладзілі студэнты пад кіраўніцтвам вядомага этнахарэографа, даследчыка танцавальнай спадчыны Міхаіла Козенкі *(на здымку)*. Як выкладчык, ён уважліва назіраў з залы за сваімі выхаванцамі, фіксаваў відэакамерай кожнае па. Такі відэазапіс спатрэбіцца, каб потым параўнаць студэнцкае выкананне танца з тым, як здаўна танцуюць у вёсцы.

Менавіта ў вёсках розных рэгіёнаў Беларусі былі сабраны гэтыя ўзоры танцавальнай і песеннай спадчыны. Студэнты неаднаразова бывалі там у экспедыцыях, пераймалі ад вясковых полькі, кадрылі, традыцыйныя песенныя і гульнявыя карагоды.

Акадэмічны канцэрт-справаздача супаў для малодых этнолагаў і фалькларыстаў з самым адказным часам: зараз падводзяць вынікі іх вучобы, і праз некалькі месяцаў яны атрымаюць дыпломы. Веды народнай спадчыны і павага да яе назаўжды застануцца для іх бясцэнным здабыткам.

**Яўген ПЯСЕЦКІ,**
**фота аўтара.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.07 | 16.51 | 7.44 |
| Віцебск — | 9.04 | 16.33 | 7.29 |
| Магілёў — | 8.57 | 16.41 | 7.44 |
| Гомель — | 8.46 | 16.45 | 7.59 |
| Гродна — | 9.21 | 17.08 | 7.47 |
| Брэст — | 9.14 | 17.16 | 8.02 |

### Месяц

*Апошняя квадра ў 9.40.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

### Імяніны

***Пр.** Ганны, Тацццяны, Аляксандра, Аляксея, Анатоля, Івана.*
***К.** Клаўдзіі, Францішка.*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ЗАЎТРА





ПРОДАЕМ

**СЕТКА-РАБІЦА** от производителя – 134 900 рублей; **ТЕПЛИЦА** 3 410 000 рублей; **СТОЛБЫ** 62 000 рублей; **ПРОФИЛЬНЫЕ ТРУБЫ, ВОРОТА, ПРОФЛИСТ, БЕСЕДКИ**

**БЫТОВКА МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ** 12 960 000 рублей; **АРМАТУРА, КАЛИТКИ, КРОВАТЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ, ПОСТЕЛЬНОЕ БЕЛЬЕ, ДВЕРЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ** 1 350 000 рублей

ДОСТАВКА БЕСПЛАТНАЯ! В течение 2–5 дней

Консультация по телефонам: +375 33 311 66 71, +375 29 947 19 44.

УНП 391802438



Утерянную печать индивидуального предпринимателя Литягевича Сергея Петровича (УНП 192351928) считать недействительной.


■ Чулі?

## У ЗІМОВУЮ КАЗКУ — НА СВЯТОЧНЫМ ЭКСПРЭСЕ

**«Навагодні экспрэс» Дзіцячай чыгункі прыме першых пасажыраў 24 снежня ў Мінску, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.**

Святочны цягнік будзе курсіраваць ў дні зімовых канікул, калядных і навагодніх свят — па 7 студзеня. Першы ў гэтым сезоне «Навагодні экспрэс» пад кіраваннем юных чыгуначнікаў адправіцца з перона станцыі Заслонава 24 снежня ў 10.30. Дзіцячая чыгунка запрашае мінчан і гасцей сталіцы здзейсніць незабыўнае падарожжа па заснежаным лесе. Сёлета сумесна з Мінскім палацам культуры і спорту чыгуначнікаў традыцыйна на станцыі Сасновы Бор будзе арганізавана тэатралізаванае шоу з удзелам казачных герояў, Дзеда Мароза і Снягуркі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


СЕТЬ МАГАЗИНОВ КРОНОС ПРЯМЫХ ПОСТАВОК

НАШИ МАГАЗИНЫ:
• г. МИНСК, ул. Боровая, 1 Территория ТВЦ "Аквабел"
• Брестская обл., д. Пески-1 (трасса М1-Е30)

ЗВОНИТЕ ПРЯМО СЕЙЧАС!
+375 (33) 391 96 30
+375 (44) 712 12 03

НАДОЕЛО НАНИМАТЬ ТРАКТОР, ПРОСИТЬ, ПЛАТИТЬ, ПОДСТРАИВАТЬСЯ?
ЕСТЬ ОТЛИЧНОЕ РЕШЕНИЕ ПРОБЛЕМ!
Т-15 КЕНТАВР РЕСТАЙЛИНГ

+3 ПОДАРКА
+ ПРИЦЕП
+ ПЛУГ
+ ФРЕЗА



• Японский дизельный двигатель КАМА
• Водяное охлаждение
• Блокировка дифференциала
• Электростартер
• Восьмиступенчатая коробка передач
• Регулируемая колея

KRONOS5.BY

6 ПРИЧИН КУПИТЬ В КРОНОС
100% гарантия возврата денег | Цена от первого поставщика | Выездной сервисный центр | Быстрый кредит по телефону | Предпродажная подготовка | Бесплатная доставка до порога

СВИД. ВЫДАНО МИНСКИМ РАЙИСПОЛКОМОМ 6.11.2014 г. ООО "ФАРАНЕЙ" УНП 192372716


■ Ну і ну!

## ФУТБОЛ НЕ ПАДАБАЕЦЦА? СПЫНІМ!

**Лідар Маўрытаніі Махамед ульд Абдэль Азіз навадаў матч за Суперкубак краіны па футболе паміж камандамі «Тэўраг-Зэйна» і «Ксар».**

Пасля перапынку прэзідэнт яўна засумаваў і на 63-й хвіліне загадаў спыніць паядынак і загадзя прабіць серыю 11-метровых удараў. У выніку перамогу атрымаў «Тэўраг-Зэйна». Рашэнне было прынята пасля перамоў з трэнерамі і прэзідэнтамі клубаў.

**Якаў ЖУРБІН.**

### УСМІХНЕМСЯ

**З назіранняў халасцяка.**
**Ад жанчын велізарная карысць, нават калі яны абяцаюць і не прыходзяць: зубы пачышчаны, гладка паголены і спіш на свежых прасцінах! Плюс добрае віно, шакалад і садавіна! Ну і парадак у доме.**

Хацела спаць. Выпіла моцнай кавы. Па-ранейшаму хачу спаць, але ўжо больш энергічна.

**— Дарагая, налі кампоту! Не бачыш, як мне дрэнна?..**
**— Табе якога кампоту, персікавага ці вішнёвага?**
**— А-гур-ко-ва-га!**

Юныя карыстальнікі інтэрнэту ў шоку: яны даведаліся, што лайкі — гэта сабакі!

**— У вас ёсць шампунь?**
**— Так. Для якога тыпу валасоў?**
**— Для брудных.**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4667.
Нумар падпісаны ў 19.30 2 снежня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12